**КІРЧУ́К** Іван Іванавіч (н. 14.9.1958, г. Ліда), музыкант, фалькларыст, кампазітар. Скончыў Лідскае музычнае вучылішча (1977), Мінскі інстытут культуры (1985). З 1982 загадчык аддзялення «Абрадавая дзейнасць і фальклор» Мінскага вучылішча мастацтваў, з 1995 у Нац. цэнтры творчасці дзяцей і моладзі, з 1997 выкладчык Бел. педагагічнага універсітэта. На базе Мінскага вучылішча мастацтваў стварыў вучэбныя лабараторыі і фалькл. гурты «Прадвесне», «Бліскавіца», «Дабрадзеі», «Дзіва», якія ў розныя гады сталі лаўрэатамі фестываляў у Германіі, Польшчы, Літве, Эстоніі, Расіі. Паставіў праграмы: «Свята ў вёсцы» (1983), «Вяселле на Віцебшчыне» (1985), «Мацей і Аўдзей на вячорках» (1986), «Некруты» (1994), «Русальныя розыгры» (1995) і інш., гарадскія і раённыя святы «Купалле» (1989), «Каляды» (1990), у якіх стылізаваў аўтэнтычны фальклор. Рэканструяваў традыцыйны лялечны тэатр батлейка з нар. майстрамі В.Цішковым і А.Муравейкам. Заснавальнік і лідэр этнатрыо *«Троіца»*, які сінтэзуе аўтэнтычны фальклор з сучаснымі музычнымі стылямі. Аўтар сольнай праграмы «Святы вечар» (2003), спектакля «Варажбіт» (2004). У творчасці па-майстэрску ўплятае ў бел. песенную традыцыю сучаснае гучанне, рытм, уводзіць нетрадыцыйныя для Беларусі музычныя інструменты. Выдаў кампакт-дыскі «Троіца» (1998), «Журавы» (2001), «Спадчына загінуўшых вёсак» (2003), «Сем» (2004). Стварыў і ўзначаліў Міжнародны дзіцячы фонд «Зберажы спадчыну» (1995—98). Аўтар-складальнік кнігі «Тэатралізаваныя школьныя святы» (2004, з А.Лозкам). Сабраў унікальны этнаграфічны музей. Вядзе гастрольную дзейнасць, у т.л. за мяжой. Пра К. зняты відэафільм «Іван Іванавіч» (2002).

*У. А. Васілевіч, А. І. Гурчанка.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ